*Дзяніс Дук*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ Ў ГОРАДЗЕ ПОЛАЦКУ І ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ

У ліпені 2006 г. праводзіліся археалагічныя раскопкі на тэрыторыі старажытнага Запалоцкага пасада горада Полацка. Дазвол № 1713 па форме № 1 выдадзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі на імя Дука Д.У. Раскопкі праводзіліся сіламі студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей Полацкага дзяржаўнага універсітэта.

Упершыню археалагічныя раскопкі ў Запалоцці археалагічным атрадам ПДУ праводзіліся ў 2003 і 2004 гг. У 2004 г. была адкрыта невядомая раней частка Запалоцкага пасада старажытнага Полацка на плошчы 21 га. Раскопкі 2006 г. праводзіліся ў працяг работ 2004 г. У 2004 г. у Запалоцці было закладзена 8 шурфаў і раскоп 1 (140 кв. м). агульная раскапаная ў 2004 г. плошча склала 154 кв. м.

Раскоп 2 (168 кв. м) зроблены ў працяг раскопу 1 на адлегласці каля 550 м на захад ад сучаснай забудовы Запалоцця. Мэта раскопак -удакладненне характару адкрытага ў 2004 г. пасялення і працягласці яго існавання.

Культурны пласт раскопу 2 мае магутнасць 0,8—1,6 м. Выразна вылучаюцца тры стратыграфічныя гарызонты, з якіх найбольшую колькасць знаходак утрымлівае сярэдні стратыграфічны гарызонт (вопіс індывідуальных і масавых знаходак утрымлівае адпаведна 50 і 2733 пазіцый). Даследаваны

рэшткі абарончых збудаванняў старажытнага пасада. Сабрана прадстаўнічая калекцыя вырабаў з бронзы (крыжападобная прывеска, бразготкі, бранзалеты і інш.), знойдзены сярэбраны пярсцёнак, сердалікавая і шкляная пацеркі, вырабы з жалеза, косці, каменю і вялікая колькасць кавалкаў керамічнага посуду, пераважна гаршкоў. Атрыманы матэрыял дазваляе вызначыць сляды ювелірнай вытворчасці на месцы раскопу (бронзавы пінцэт, нарыхтоўкі і ювелірныя вырабы, кавалкі тыгляў). Усе рэчы сярэдняга стратыграфічнага гарызонта датуюцца ў межах XI—XII стст. Адзначым выдатную захаванасць культурнага пласта Запалоцця.

Падчас раскопак 2006 г. было пацверджана выказанае раней меркаванне, што ў XI—XII стст. плошча Запалоцкага пасада, а адпаведна і старажытнага Полацка, была большая як мінімум на 21 га, і ў гэтыя часы пасад меў плошчу не менш за 40 га. Вывучаны культурны пласт з матэрыяламі XI—XII стст. дазваляе разглядаць Запалоцкі пасад як адно з самых старажытных пасяленняў у тапаграфічнай структуры горада. У XI ст., магчыма, ужо напрыканцы X ст., пасад размяшчаўся ўздоўж Дзвіны на 1300 м на захад ад вусця Палаты, ён быў умацаваны драўляным парканам і, магчыма, меў абарончыя вежы. У пачатку XIII ст. адбываецца скарачэнне тапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада, ён дасягае сучасных межаў, а заходняя яго частка застаецца па-за межамі гарадской забудовы да нашых дзён.

На працягу ліпеня—жніўня праводзіўся археалагічны нагляд на Верхнім замку падчас пракладання інжэнерных сетак на аб'екце "Рэканструкцыяінфекцыйнага аддзялення бальніцы Полацкага ГТМО па вул. Замкавая, 12" (пляцоўка на адлегласці каля 100 м на поўнач ад Сафійскага сабора). У выніку даследавання была зафіксавана стартыграфія культурных напластаванняў у сярэднім на глыбіню да 1,8 м. Вынікі даследавання дазволілі вызначыць баластны характар большай часткі культурных напластаванняў. Сабраны пад'ёмны матэрыял (пераважна рэшткі керамікі і нешматлікія побытавыя вырабы з жалеза XVIII—XIX стст.). Сярод знаходак адзначым 3 свінцовыя пломбы XII—XIII стст. і пачатку XVI—XVIII стст.

Археалагічныя раскопкі на могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна праводзіліся ў жніўні 2006 г. Упершыню помнік быў адкрыты ў 2004 г. жыхаром Полацка Елісеевым Ігарам Андрэевічам. Інфармацыю пра могільнік мы даведаліся ад полацкага краязнаўцы С.М. Глушкова і гісторыка Л.Ф. Данько.

Грунтовы могільнік знаходзіцца на адлегласці 0,3 км на ўсход ад вёскі Туржэц 2 (мясцовая назва Турэц) на вясковых могілках. Пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка ПДУ Тоўбаса А.К. быў зроблены геадэзічны план могільніка. Старажытныя пахаванні размешчаны ў цэнтры вясковых могілак агульнай плошчай 1,6 га, старажытныя пахаванні займаюць плошчу каля 0,32 га. Старажытныя пахаванні размешчаны радамі па накірунку паўднёвы-захад—паўночны-ўсход ушчыльную адзін да аднаго. Пахаванні ўяўляюць сабой ладдзепадобныя каменныя агароджы даўжынёй каля 1,5—2 м, шырынёй каля 1 м. Памеры камянёў у сярэднім каля 0,4 м, асобныя — больш за 1 м. З паўднёва-ўсходняга боку, як правіла, размешчаны вялікі камень з салярнай сімволікай, выявамі крыжоў, крыжа ў паўколе і іншымі знакамі. Было вырашана правесці археалагічныя раскопкі з мэтай высвятлення характару і часу пахаванняў, а таксама дзяржаўнай рэгістрацыі і аховы адкрытага помніка.

Раскоп 1 (9 кв. м) размешчаны ў паўночна-заходняй частцы могілак на месцы трох пахаванняў, агароджаных вялікімі камянямі (дыяметр у сярэднім 0,4—0,5 м). У раскопе прымалі ўдзел валанцёры з ліку жыхароў гг. Полацка і Наваполацка, а таксама старшы выкладчык ПДУ, антраполаг В.А. Емяльянчык. Былі адкрыты шкілетныя рэшткі трох чалавек: жанчыны ва ўзросце больш за 60 год (пахаванне № 1), дзяўчынкі ва ўзросце 4—5 год (пахаванне № 2) і мужчыны ва ўзросце 40—50 год (пахаванне № 3). Па выніках антрапалагічнай экспертызы жаночыя і мужчынскія чарапы былі аднесены да групы сельскага насельніцтва Беларусі XVIII—XIX стст. Пахаванні безінвентарныя (за выключэннем пахавання дзяўчынкі), зроблены ў драўляных трунах (пахаванне жанчыны — у даўблёнай калодзе, астатнія — у трунах з дошак). На целе дзяўчынкі знойдзены алавяны крыжык і каралі: з бісера (116 шт.), чатырох пацерак цёмна-сіняга колеру, адной пацеркі белага і адной — чорнага колераў. У раскопе знойдзены кавалкі гаршкоў, якія датуюцца ад XVII да пачатку XX ст. Археалагічны матэрыял сведчыць, што пахаванні былі зроблены ў першай палове XVIII ст. і належалі сельскаму насельніцтву фальварка Турэц — маёмасці полацкага езуіцкага калегіума.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова